*УДК 392.1(476.2-37Брагін)*
**Л. А. Масанавец**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***
# ТРАДЫЦЫІ РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ РОДНАЙ ВЁСКІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ ВЁСКІ АЛЯКСЕЕЎКА БРАГІНСКАГА РАЁНА)

*У артыкуле, прысвечаным радзінна-хрэсьбінным абрадам і звычаям беларусаў, засяроджана ўвага на іх мясцовай спецыфіцы. Аўтар на аснове ўласных экспедыцыйных матэрыялаў, запісаных ў в. Аляксееўка Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, а таксама архіўных запісаў аналізуе асноўныя структурныя кампаненты радзінна-хрэсьбіннай абраднасці.*

Радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні ўстойліва захоўваюцца ў народнай памяці жыхароў Гомельшчыны, пра што сведчыць зборнік «Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці)» (2013 г.), укладальнікамі якога з'яўляюцца Новак В. С., Шынкарэнка В. К., Кастрыца А. А. і інш. Прадстаўленыя ў кнізе экспедыцыйныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы ахопліваюць усе раёны Гомельскай вобласці. Звесткі па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Брагінскага раёна, якія змешчаны ў дадзеным выданні, запісаны падчас палявых экспедыцый у такіх вёсках, як Буркі, Вуглы, Новы Шлях, Зарэчча, Краснае, Лубенікі, Рытаў, Старыя Хракавічы, Чамярысы. Засяродзім увагу на фактычным матэрыяле па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, зафіксаваным у маёй



роднай вёсцы Аляксееўка. У артыкуле выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры УА ―Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны.

Як вядома, радзінна-хрэсьбінны абрадавы комплекс уключае дародавы, родавы і пасляродавы перыяды. У нашай мясцовасці бытуе шмат прыкмет і павер'яў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны і родамі, аб чым мне распавядала маці. Аснову пэўнай колькасці прыкмет і павер'яў складае прынцып магіі знешняга або ўнутранага падабенства. Зыходзячы з гэтага, цяжарнай жанчыне забаранялася, напрыклад, прасці, ткаць і вязаць («Шыць і вязаць тожэ нельзя было» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.)), а таксама не дапускалася, каб на жываце быў пояс: «Бярэменным нельзя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

завязываць пояс на жываце, бо дзіця будзе перавязана пупавінай» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.).
Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, цяжарным жанчынам забаранялася працаваць у святочныя дні. Лічылася, што, калі цяжарная жанчына праігнаруе гэтае правіла, гэта адмоўна паўплывае на нованароджанага, асабліва на яго знешні выгляд: «Бярэменным нельзя ў празнікі ўбіваць петуха ілі курыцу, бо ў дзіцѐнка будзе грэбень» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Іншы раз нашкодзіць знешняму выгляду дзіцяці маглі і некаторыя дзеянні будучай маці, напрыклад, невыпадкова ѐй забаранялася падразаць валасы: «Бярэменнай нельзя стрыгці волосы, бо ў дзіцѐнка яны будуць рэдкімі, жыдкімі і непрыгожымі», забаранялася дакранацца да жывѐл: «Самой бярэменнай нельзя біць жывотных, таму што можа быць дзіцѐнак з шэрсцю» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Не дазвалялася такасама цяжарнай жанчыне рэагаваць на непрыемныя пахі: «Нельзя "фукаць", калі слышыш непрыемныя запахі, каб не пахла ў дзіцѐнка са рта. Бо, кажуць, калі будзеш фукаць, то ў дзіцѐнка будзе пахнуць са рта.» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.).
Важна адзначыць, што жанчыны-парадзіхі асцерагаліся знаходзіцца каля парога. «Парог, найбольш рытуалізаваны сімвал мяжы паміж хатай як максімальна засвоенай, ―акультуранай‖ чалавекам часткай прасторы і навакольным, патэнцыйна варожым светам (іншасветам, светам памерлых) » [1, с. 349]. Невыпадкова, каб не было ўскладненняў падчас родаў, у мясцовай традыцыйнай культуры забаранялася жанчыне-парадзісе стаяць на парозе або каля яго: «Бярэменным нельзя стаяць ў парогі, бо роды цяжолыя будуць» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны 1980 г. н.).

У прыкметах і павер‘ях, звязаных з цяжарнасцю жанчыны, знайшлі таксама адлюстраванне і наступныя міфалагічныя ўяўленні: нельга было адмаўляць жанчыне-парадзісе, калі яна звярталася з той ці іншай просьбай да суседзяў: «Нельзя атказываць, бо будзе многа мышэй» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.).
Прытрымліваліся мясцовыя жыхары народных вераванняў і непасрэдна тады, калі наступаў час для жанчыны-парадзіхі нараджаць дзіця: «Падчас родаў жанчыне нельзя туга заплятаць волосы, патаму што не сможа радзіть. Нада штоб волосы былі распушчаны»
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

(запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.).
Сярод структурных кампанентаў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці в. Аляксееўка вылучаюцца адведкі, якія ў мясцовай традыцыі вядомы пад назвай «*водведы*»: «У водведы да рожаніцы прыходзілі пасля 40 дней. Прыходзілі толькі жэншчыны, мужчынам нельзя. Прыносілі адзежду, ігрушкі дзіцѐнку. На стол пеклі хрушчыкі ці яечню» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). На гэта мерапрыемства прыходзілі сяброўкі або жанчыны, якія ўжо мелі дзяцей. Яны глядзелі на дзяцѐнка, а баба гаварыла: «Каб цябе куры абасралі» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Гэты неэтычны славесны выраз, зыходзячы з народных уяўленняў, з‘яўляўся сімвалічным пажаданнем здароўя немаўляці, каб нованароджаны рос дужым і з добрым імунітэтам. Сѐння ў нашай вѐсцы ў ролі жанчыны, якая «бабіць» нованароджанага, выступае маці жанчыны-парадзіхі.
Звернем увагу на той факт, што і ў сучасным жыцці жыхары Брагіншчыны імкнуцца здзейсніць пэўныя дзеянні, каб засцерагчы дзіця «ад зглазу», ад «нядобрых позіркаў». Напрыклад, «каб не сглазілі, дзіця адзяваюць у вешчы навыварат або прышпуліваюць булаўку ўніз галавой. Таксама нельзя паказывать дзіцѐнку да года зеркала, бо можа ўбачыць сябе і спугацца» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Другім адказным момантам ў жыцці маладой маці з‘яўляецца прывучванне дзіцяці да самастойнага харчавання. З гэтай мэтай выкарыстоўваюць розныя спосабы: нехта змяншае памеры соскі, нехта перавязвае малочныя залозы: «Калі ужэ перавязалі грудзь, каб дзіцѐнка адвучыць ад грудзі, болей ужо нельзя даваць, бо будзе дзіцѐнак урачлівы» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.).
Як адзначыў фальклярыст А. С. Фядосік, «важнейшым абрадам у радзінах славянскіх народаў было хрышчэнне, у якім абмыванне вадой, ачышчэнне нованароджанага, як і ў язычніцкім абрадзе, мела ахоўны сэнс» [3, с. 31]. Невыпадкова надзвычай важна для бацькоў

было выбраць кумоў, якіх лічылі ганаровымі асобамі не толькі на хрэсьбінах, але і ўвогуле ў будучым жыцці немаўляці. Звычайна на хрэсьбіны ў якасці кума і кумы запрашаюць родзічаў або сяброў. Паводле народных вераванняў, кум і кума не павінны мецьь шлюбныя адносіны. Хросныя бацькі выконвалі важную функцыю падчас
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цырымоніі хрышчэння дзіцяці. Менавіта яны разам з роднымі едуць у царкву, дзе бацюшка праводзіць рытуал хрышчэння нованароджанага. З даўніх часоў бабцы-павітусе адводзілася важная роля – падрыхтаваць для хрэсьбіннага застолля абрадавую страву («бабіну кашу»): «Тым часам баба гатуе кашу ў печы, звычайна гэта каша гатуецца ў гліняным або чыгунным гаршку з рысу і проса з вялікай колькасцю слівачнага масла. Боршч гатовяць толькі на похараны» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Калі бабкапавітуха прыносіць кашу, то гасцей запрашаюць сесці за стол. Гаршчок
з кашай ставяць на стол, і пачынаецца яе выкуп. Адметным момантам ў радзінна-хрэсьбіннай абраднасці в. Аляксееўка з‘яўляецца той факт, што кашу выкупляе не заўсѐды абавязкова хросны, а той з прысутных гасцей, хто больш пакладзе грошай на яе. Абрад разбівання гаршка з кашай адбываўся так: «Гаршчок разбіваюць аб край стала, а чарапкі не чапаюць. Кашу ядзяць, п‘юць, гуляюць, а ў канцэ бабу адвозяць дадому на тачцы або, еслі зіма, на санках. Мы эта называем «вадзіць хвост». Ідом, шуцім і смяѐмся» (запісана ад Масанавец Аксаны Пятроўны, 1980 г. н.). Калі ўдзельнікі цырымоніі «павадзілі хвост», усе госці разыходзяцца і хрэсьбіны завяршаюцца.
Прыведзеныя ў артыкуле матэрыялы пацвярджаюць устойлівы характар бытавання радзінна-хрэсьбіннай абраднасці і мясцовыя запісы узбагачаюць рэгіянальную традыцыю.

**Спіс літаратуры**

1 Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.
2 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўт.-ўкл. : В. С. Новак [і інш.]. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с.
3 Фядосік, А. С. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Бел. Навука, 2001. – 422 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ